# ГРЫШКО РЫШАРД ІОСІФАВІЧ

Нарадзіўся 30.01.1959г. ў в. Лазарышкі Воранаўскага сельсавета. Скончыў Гродзенскі універсітэт (1986). З 1981г. працаваў настаўнікам гісторыі Беняконскай, з 1991 г. Канвелішскай сельскай школы. Цікавіцца гістарычнай і культурнай спадчынай краю: гісторыяй населенных пунктаў Воранаўшчыны, біяграфіямі славутых людзей. Вывучае сувязі знакамітага паэта Адама Міцкевіча з Воранаўшчынай, архітэктурныя помнікі Воранаўскага раёна. Матэрыялы выкарыстоўваліся для напісання раённай Кнігі Памяці.

Рышард Іванавіч друкаваўся ў раённай “Воранаўскай газеце”, польскамоўнай газеце “Глос з-пад Немна”. Прымаў удзел у зборы матэрыялаў для краязнаўчага музея Беняконскай школы, гісторыка-этнаграфічнага музея Канвелішскай сельскай школы. Вядзе гурток “Юны краязнаўца”.

**Бібліяграфія:**

1. Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Воранаўскага раёна / рэд.кал.: Г.П.Пашкоў (гал.рэд.) і інш.; мастак Э.Э.Жакевіч. – Мінск: БелЭн., 2004. – С. 443.